# У пошуках рарытэтаў ад князёў Агінскіх

***Цешыць маю душу тое, што сёння вяртаюцца з небыцця многія занядбаныя на стагоддзі мясціны Беларусі з багатай гісторыка-культурнай, архітэктурнай і духоўная спадчынай. Многія ацалелыя храмы могуць прэтэндаваць на помнікі сусветнай культуры. А палацы – ўзоры гарманічнага спалучэння сусветных архітэктурных стыляў з мясцовымі асаблівасцямі. Збег абставінаў ператварыў колішнія адміністрацыйныя і гандлёвыя цэнтры нашага краю ў закінутыя вёскі, у лепшым выпадку – цэнтры сельсаветаў. І толькі манументальныя збудаванні ды нетыповыя для савецкага дойлідства палацы нагадвалі пра колішнюю значнасць мясцін і ўплывовасць іх гаспадароў. Сёння сітуацыя мяняецца, хоць не так хутка, як хацелася б, але ўсё больш рарытэтаў паўстаюць з руінаў, нібы чароўная птушка фенікс.***

Вандроўкі з сябрамі Маладзечанскага мясцовага дабрачыннага фонду “Нашчадкі М. К. Агінскага” заўжды ператвараюцца ў пошукавую экспедыцыю поўную прыгод, якія фантастычным чынам пераносяць вандроўнікаў у мінуўшчыну. І, здаецца, не аўтобус вязе нас старым гасцінцам, а фурманка князя Агінскага коціцца па бруку Вялікага княства Літоўскага. Абапал шляху ўзнікаюць мураваныя ды драўляныя сведкі багатай гісторыі краю.

Фонд быў створаны нераўнадушнымі маладзечанцамі, якія часцяком наведваліся ў занядбаны палаца-паркавы комплекс у Залессі. Пасля рэстаўрацыі палаца і адкрыцця там музея М. К. Агінскага, дзейнасць фонда не прыпынілася, а набыла новыя напрамкі ў папулярызацыі культурнай спадчыны слыннага дзяржаўнага дзеяча і кампазітара. Сёння сябры фонда вядуць пошук іншых мясцін, якія належылі князям Агінскім, дзеля аднаўленне згадак пра асветніцкую дзейнасць слыннага роду, захаванне памяці пра гісторыка-культурныя помнікі.

Чарговая паездка адбылася напрыканцы жніўня. На гэты раз шляхі-дарогі вялі нас на Віцебшчыну. Краязнаўца і даследчык спадчыны князёў Агінскіх Валерый Бурэнь, які стаў нашым гідам, мае звесткі больш як пра сорак палацаў гэтага слыннага роду на тэрыторыях былога Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Некаторыя будынкі Агінскія набывалі, многа будавалі новых або перабудоўвалі. Найбольшая колькасць іх архітэктурнай спадчыны захавалася ў сучанай Літве. А якія рарытэты ёсць на Віцебшчыне, і менавіта на Браслаўшчыне і Пастаўшчыне?

Першым пунктам, дзе мы прыпыніліся, былі Лучаі. З Агінскімі звязаны “залаты век” гэтага паселішча. Тут была любімая рэзідэнцыя княгіні Эльжбеты Агінскай, якой Міхал Клеафас даводзіцца ўнучатым пляменнікам. Сёння ўражвае сваёй узнёслай прыгажосцю трохнефавая крыжова-купальная базыліка, якую пачынала будаваць княгіня Эльжбета, а завяршыў яе брат Тадэвуш Агінскі, у гонар якога ў 1777 годзе храм і быў асвечаны ў гонар

Святога Тадэвуша. Аўтарам праекта храма лічыцца італьянскі архітэктар Карла Спампані, які на той час выкладаў архітэктуру ў Віленскай акадэміі езуітаў. Што да мецэнацкай дзейнасці гаспадыні Лучаяў, то яна вядома, як апякунка ўніверсітэта ў Вільні, а яе імя занатаваў у сваёй слыннай паэме “Пан Тадэвуш” Адам Міцкевіч. Адзін з герояў твора наступным чынам распавядаў пра гады свайго навучання ў Віленскай езуіцкай акадэміі:

***“...Я сам у курсе***
***Астранамічных ведаў быў у бурсе,***
***Галоўнай школы ў Вільні.***
***Там за сродкі Пузынінай, багатай патрыёткі,***
***Мы мелі тэлескоп (усе выдаткі***
***Былі збалансаваны за падаткі***
***З двухсот двароў халопскіх – з рук у рукі),***
***падтрымлівала пані храм навукі.”***



***Помнік Тадэвушу Агінскаму ў Лучаі.***

На вялікі жаль не захаваўся ў Лучаях шыкоўны палац Эльжбеты Пузыны з Агінскіх. Але на тэрыторыі касцёла ў цэнтры штучнага вадаёма знаходзіцца яго макет. Унутранае ўпрыгожванне храма уражвае трохмерным фрэскавым роспісам – гэта так званы грызайль, які імітуе скульптурную лепку.



***Макет палаца Агінскіх у Лучаі.***

Калі з Лучаямі ўсё зразумела, то якія адносіны да князя Агінскага мае гаспадар палаца ў Паставах Канстанцін Тызенгаўз? Валерый Бурэнь лёгка знаходзіць тлумачэнне. Пасля вяртання з вымушанай эміграцыі Міхал Клеафас Агінскі актыўна працягвае займацца грамадскай дзейнасцю. Яго абіраюць ганаровым сябрам Віленскага ўніверсітэту. А ў 1818 годзе Міхал Клеафас, клапоцячыся пра адукацыю маладога пакалення, засноўвае ў Вільні друкарскае таварыства, мецэнатам якога быў утым ліку і Канстанцін Тызенгаўз. Грандыёзны манументальны палац у стылі класіцызму ў Паставах пачаў будаваць граф Антоній Тызенгаўз, а завяршыў яго блізкі нашчадак Канстанцін, вядомы ў навуковым свеце арнітолаг. Па згадках мемуарысткі Габрыэлы Пузыны (з Гюнтэраў, якая была сваячніцай Тызенгаўзаў, паўночная частка палаца не была заселеная, бо там знаходзіўся арніталагічны музей і карцінная галерэя. Сёння музейная экспазіцыя знаходзіцца ў падвальнай частцы палаца. А ў будынку размяшчаецца бальніца.

Трэці важны пункт нашага падарожжа – Дрысвяты. Вёска знаходзіцца ў маляўнічых азёрных мясцінах на самай мяжы з Літвой. У добрае надвор’е выдатна бачны абрысы Ігналінскай АЭС. На пад’ездзе да Дрысвятаў захавалася гідраэлектрастацыя “Дружба народаў”, пабудаваная ў 1953 годзе за сродкі двух рэспублік: Беларусі, Літвы і Латвіі. Сёння яе ўзала ў доўгатэрміновую арэнду Літоўская Рэспубліка.

Каля праваслаўнага Петрапаўлаўскага храма нас сустракае мясцовая настаўніца гісторыі і заўзятая краязнаўца Эмілія Шавела. Яна, як і Валерый Бурэнь, на свае вочы бачыла дакумент, які можа быць доказам таго, што гэта мясцовасць у свой час належала князю Міхалу Клеафасу Агінскаму. Аднак пакуль ні ў Пастаўскім краязнаўчым музеі, ні ў іншых архівах, куды звярталіся нашы гіды, не знайшлі нават копіі дакумента, у якой згадвалася мястэчка Дрысвяты ў дачыненні да Міхала Клеафаса. Вядома толькі, што тут падчас паўстання Тадэвуша Касцюшкі дзейнічаў атрад узброены Агінскім. Пакуль застаецца толькі чакаць адказу з Літвы, дзе магчыма ёсць звесткі пра ўладара Дрысвятаў першай паловы XIX ст.



***Падарожнікі каля касцёла Пятра і Паўла ў Дрысвятах.***

А тым часам Эмілія Лявонаўна запрашае нас наведаць незвычайны і вельмі ўтульны драўляны касцёл св. Пятра і Паўла, пабудаваны без адзінага цвіка.

Гэты архітэктурны помнік узведзены на ўзгорку, з якога адкрываецца цудоўная панарама навакольных азёраў, выспа Замак, дзе захаваліся земляныя валы, а ў паўночнай частцы – каменны крыж чатырнаццатага стагоддзя. Пра гэты востраў ходзіць шмат паданняў. Эмілія Лявонаўна апавядае, што разам са сваімі вучнямі некалі нават ладзілі раскопкі і знаходзілі старажытныя рэчы. Але клад, пра які распавядаюць легенды, так ніхто і не знайшоў.

Прагуляўшыся па парку апошніх гаспадароў Дрысвятаў баронаў фон Гільденбандтаў, накіроўваемся ў беларускую турыстычную Мекку - Браслаў. Шыкоўны выгляд адкрываецца з Замкавай гары, на якой некалі стаяў замак, яго руіны захоўваліся да канца 18 стагоддзя. Зараз тут толькі драўляныя скульптуры міфічных істот і памятны знак з гербам горада. На самым высокім месцы горда ўздымаецца помнік над магілай доктара медыцыны, грамадскага дзеяча Станіслава Нарбута, якога вельмі шанавалі мясцовыя жыхары,аён быў улюбёныў гэтыя каларытныя мясціны.

Вядома ж, наша вандроўка не абмежавалася толькі трыма галоўнымі мясцінамі, таму што Браслаўшчына – кладзезь выдатных гісторыка-культурных і архітэктурных помнікаў. Тут, дзякуючы мясцоваму люду, захаваліся найпрыгажэйшыя на Беларусі храмы, напрыклад, ў Слабодцы помнік архітэктуры неараманскага стылю - касцёл Божага промыслу – самы незвычайны па смеласці роспісу і каляровай гаме ўнутранага аздаблення. А ў Відзах – адзін з самых высокіх у нашай краіне - манументальны касцёл нараджэння Найсвяцейшай Багародзіцы. У вёсцы Опса – касцёл Святога Яна Хрысціцеля на маляўнічым беразе возера.

Прыгожым жнівеньскім вечарам вяртаемся дадому. Развітваемся да новай паездкі, якую будзем ладзіць па гістарычнай Гродзеншчыне.

**Ала КЛЕМЯНОК.**

Фота аўтара.